Контрольный экземпляр - Філ. 959

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па гуманітарнай адукацыі**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_________ А.І.Жук
10.12.2012

Рэгістрацыйны № ТД- Д.218 /тып.

# Сучасная літаратура Беларусі

## Тыпавая вучэбная праграма для ўстаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці:

**1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)**

**УЗГОДНЕНА**

Старшыня Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі
_________ У.Л. Клюня
17.0...

**УЗГОДНЕНА**

Начальнік Упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
_________ С.І. Раманюк
10.12.2012

**УЗГОДНЕНА**
Прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"
_________ В.І. Шупляк
17.09.2012

Эксперт-нормакантралёр
_________ І.М. Карэлі
17.09.2012

Мінск 2012

Аўтары-складальнікі:
Бельская Таццяна Віктараўна, старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
Верабей Анатоль Леанідавіч, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук;

Навуковы кансультант:
Сінькова Людміла Дзмітрыеўна, прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук;

Рэцэнзенты:
Кафедра беларускай літаратуры ўстановы адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы";

Васючэнка П.В., загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт", дацэнт, кандыдат філалагічных навук.

Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:

Кафедрай беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 5 ад 23 лістапада 2010 года);

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 2 ад 21 лютага 2011 года);

Навукова-метадычным саветам па філалагічных спецыяльнасцях
Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі (пратакол № 4 ад 11 лютага 2011 года).

Адказны за рэдакцыю: Т.В. Бельская
Адказны за выпуск: Т. В. Бельская

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У паняцце «сучасная літаратура» ўваходзяць мастацкія творы, напісаныя за адрэзак часу, цесна звязаны з сённяшнім днём грамадскага развіцця. Гэты перыяд заўсёды больш працяглы, чым той адрэзак часу, які ахоплівае ўсяго некалькі гадоў і называецца «бягучы літаратурны працэс». Паняццем «сучасная літаратура» аб'ядноўваюцца ідэйна-эстэтычныя з'явы з выразнымі характэрнымі адзнакамі ўнутранага адзінства, адрознымі ў нечым ад папярэдняй літаратуры і здольнымі фарміраваць сабой новы этап у гісторыі нацыянальнага мастацтва.

Літаратура звязана з грамадскім жыццём, яна сама з'яўляецца адной з форм грамадскай свядомасці, таму зразумела, што кожны новы этап у яе развіцці ў значнай ступені залежыць ад сацыяльных зрухаў і пераўтварэнняў.

Агульнапрынята лічыць храналагічным пачаткам сучаснага перыяду ў развіцці беларускай літаратуры сярэдзіну 80-х гадоў XX стагоддзя. Менавіта з гэтага часу літаратура перажывае паласу ідэйна-эстэтычных змен, выкліканых абнаўленнем грамадства ў палітычнай і духоўнай сферы. Другая палова 80-х гадоў XX стагоддзя — час напружанага роздуму і аналізу ў грамадскім жыцці. У гэтыя гады з'яўляюцца творы, дзе аўтарская пазіцыя вызначаецца асаблівай грамадзянскай смеласцю, дзе адкрыта ставяцца і вырашаюцца надзённыя, неадкладныя праблемы далейшага сацыяльнага прагрэсу ў краіне. Актывізуецца таксама зварот да ўласна-эстэтычных эксперыментаў, да дэмакратычных і элітарных мастацкіх форм, узбагачаюцца адносна новыя, г.зн. менш распрацаваныя ў беларускай літаратуры, стылі і жанры.

Пільная ўвага да рэальнага ходу жыцця, глыбокі аналітызм аўтарскай пазіцыі, выразнае грамадзянскае пачуццё будуць паступова ўзбуйняцца, пранікаць ва ўсю літаратуру, таму ёсць падстава бачыць у адзнаках ідэйна-мастацкай пазіцыі аўтараў гэтага перыяду пачатак новага ўздыму літаратурнай творчасці, а сучасную літаратуру як пэўнае звяно ў агульным руху мастацкага мыслення вывучаць асобна. Разам з тым сучасны перыяд літаратурнага развіцця не адмаўляе лепшых мастацкіх дасягненняў папярэдніх гадоў, а ўздымае літаратурнае жыццё, развіваючы лепшыя традыцыі мінулага, на новую ступень арганічнага і заканамернага росту.

**Мэта дысцыпліны:** раскрыццё ідэйна-мастацкага, жанравага і тэматычнага багацця сучаснай беларускай літаратуры, паглыбленне ведаў пра сучасны літаратурны працэс у краіне як ідэйна-эстэтычнае адзінства. У дадзенай праграме асаблівая ўвага звернута на творы, якія валодаюць бясспрэчнымі мастацкімі вартасцямі і глыбока адлюстроўваюць багаты ўнутраны свет сучасніка.

**Задачы дысцыпліны:**

- садзейнічаць вывучэнню сучаснай літаратуры Беларусі ў яе ідэйна-мастацкай, жанравай і тэматычнай разнастайнасці;

- дапамагчы асэнсаванню сувязей беларускай сучаснай літаратуры з іншымі літаратурамі свету і мастацкімі творамі іншых гістарычных перыядаў;
- фарміраваць духоўнае станаўленнне асобы на лепшых гуманістычных здабытках сучаснай беларускай літаратуры (сучасная літаратура здольна непасрэдна ўводзіць чалавека ў духоўную і маральную атмасферу сённяшняга грамадства );
- выпрацаваць навыкі аналізу літаратурных тэкстаў;
- развіць творчае мысленне студэнтаў, актывізаваць іх навукова-даследчы пошук.

Пасля вывучэння дысцыпліны студэнты павінны
**ведаць :**

- асноўныя этапы творчай дзейнасці лепшых пісьменнікаў сучаснасці ў сувязі з агульным ідэйна-эстэтычным развіццём нацыянальнай літаратуры;
- жанрава-стылёвыя напрамкі сучаснай беларускай паэзіі, прозы і драматургіі;
- персаналіі беларускіх пісьменнікаў, чые творы значна ўзбагацілі нацыянальную літаратуру і сталі здабыткам духоўнага жыцця народа;
- дыялектычнае ўзаемадзеянне традыцый і наватарства ў сучаснай літаратуры Беларусі;

**умець :**

- разбірацца ў асаблівасцях твора, у характэрных рысах мастацкай індывідуальнасці пісьменніка;
- устанаўліваць ідэйна-эстэтычныя сувязі твора з папярэднім часам;
- арыентавацца ў сучасным літаратурным бягучым працэсе;
- вызначаць нацыянальныя архетыпы, сэнсаўтваральныя паняцці і эстэтычныя дамінанты ў тэксце;
- аналізаваць мастацкія творы, крытычную літаратуру па творах беларускіх аўтараў;
- вылучаць як прыярытэтныя агульначалавечыя духоўныя і маральныя каштоўнасці.

# ФОРМЫ І МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ

У працэсе выкладання дысцыпліны "Сучасная літаратура Беларусі" выкарыстоўваюцца наступныя формы і метады:

1. Вуснае выкладанне інфармацыі выкладчыкам і актыўная пазнавальная дзейнасць студэнтаў (лекцыя, расказ, тлумачэнне, ілюстрацыя, дэманстрацыя).
2. Замацаванне вывучаемага матэрыялу.
3. Самастойная праца студэнтаў па асэнсаванні і замацаванні вывучаемага матэрыялу (праца з арыгінальнымі мастацкімі і крытычнымі тэкстамі, навуковымі працамі, энцыклапедыямі; перыядычным друкам; вядзенне чытальніцкага дзённіка; выкананне дамашніх заданняў).
4. Вучэбная праца па выкарыстанні ведаў на практыцы і выпрацоўцы ўменняў і навыкаў (тэставыя заданні; праца з тэкстамі; напісанне водзываў, анатацый, рэцэнзій; напісанне рэфератаў).

Праверка і ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў (індывідуальнае, франтальнае апытванне, кантрольныя работы, індывідуальныя тэставыя заданні).

## Рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай працы студэнтаў:

- вывучэнне неабходнай навуковай, вучэбнай і навукова-метадычнай літаратуры;
- распрацоўка тэматычнага планавання на перыяд самастойнай падрыхтоўкі;
- самастойная распрацоўка канспектаў хатніх заданняў, дзённікаў зместу літаратурных твораў;
- падбор матэрыялу для навукова-даследчыцкіх праектаў па прадмеце;

Праграма дысцыпліны "Сучасная літаратура Беларусі" для спецыяльнасці 1-21 05 01 разлічана ўсяго на 52 гадзіны, з якіх 34 гадзін – аўдыторныя ( 24 – лекцыі; 10 – практычныя заняткі ). Прамежкавы кантроль на працягу яе вывучэння рэкамендуецца праводзіць у форме кантрольных прац, тэстаў, пісьмовых творчых заданняў. Форма кантролю па выніках вывучэння дысцыпліны – залік. У праграме выкарыстана сувязь з іншымі дысцыплінамі ( тэорыя літаратуры, гісторыя беларускай літаратуры XX-пачатку XXI стагоддзя, гісторыя рускай літаратуры і інш.). Праграма ўтрымлівае прыкладны тэматычны план, раздзелы з тэматыкай лекцыйных матэрыялаў, прыкладны спіс прапануемай тэматыкі рэфератаў, спіс навуковай і даведачнай літаратуры, пытанні да заліку і для самападрыхтоўкі і складзена паводле патрабаванняў адпаведных адукацыйных стандартаў.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар тэмы заняткаў | Назва тэмы заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | |
| 1 | Сучасная літаратура Беларусі: умовы і спецыфіка развіцця, падыходы да вывучэння. Частка першая<br>Сучасная літаратурв Беларусі: умовы і спецыфіка развіцця, падыходы да вывучэння. Частка другая | 2<br>2 | | 2<br>2 |
| 2 | Сучасная беларуская паэзія: дынаміка мастацкіх стыляў | 2 | 2 | 4 |
| 3 | Развіццё паэтычнага эпасу ў другой палове 80-х гг. ХХ стагоддзя – пачатку ХХІ стагоддзя | 2 | 2 | 4 |
| 4 | Сучасная беларуская філасофская паэзія | 2 | | 2 |
| 5 | Сучасная беларуская проза: асноўныя тэндэнцыі развіцця | 4 | 2 | 6 |
| 6 | Тэматычная разнастайнасць сучаснай беларускай прозы | 2 | | 2 |
| 7 | Развіццё новых жанраў у сучаснай беларускай прозе | 2 | | 2 |
| 8 | Сучасны літаратурны этап : развіццё прозы (2000 – 2012-я гг.) | 4 | 2 | 6 |
| 9 | Сучасная беларуская драматургія: традыцыі і наватарства | 2 | 2 | 4 |
| **Усяго:** | | **24** | **10** | **34** |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### ТЭМА № 1.
### Сучасная літаратура Беларусі: умовы і спецыфіка развіцця, падыходы да вывучэння. Частка першая.

Беларуская літаратура **другой паловы 1980-х – пачатку XXI** стагоддзяў як гісторыка-культурны перыяд. Перыядызацыя. Паняцце "сучасная літаратура". Сучасная літаратура як новы этап у гісторыі нацыянальнага мастацтва. Літаратура ў кантэксце агульнага палітычнага і духоўнага развіцця ў краіне і ў свеце: перабудова ў СССР у 1985 – 1988 гг. Змены ў еўрапейскай культурнай прасторы пасля 1989 г. – разбурэнне Берлінскай сцяны, змена дзяржаўных межаў шэрагу еўрапейскіх, найперш славянскіх, краін. З'яўленне новай формы беларускай дзяржаўнасці – суверэннай Рэспублікі Беларусь, 1991 г.

Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця, абвяшчэнне дзяржаўнай незалежнасці рэспублікі. Пафас абнаўлення. Паступовае пераадоленне ідэалагічнага і дзяржаўнага кантролю ў літаратуры. Інтэнсіфікацыя працэсаў духоўнага жыцця рэспублікі на сучасным этапе. Імкненне літаратуры духоўна аб"яднаць і палітычна ўмацаваць нацыю.

Чалавек, жыццё і час у мастацкай творчасці, актуальнасць і надзённасць твораў на сучасную тэму. Маштаб вырашэння мастацкіх задач: асэнсаванне літаратурай праўды пра лёс народа і чалавека ў XX стагоддзі (В. Быкаў, І. Шамякін, Я. Брыль, І. Навуменка, Р. Барадулін, В. Зуёнак і інш.); адкрыццё шэрагу архіўных матэрыялаў, звесткі пра пісьменнікаў беларускага замежжа, "вернутая спадчына" такіх класікаў, як В. Ластоўскі (у выдавецкай серыі "Беларускі кнігазбор") і інш. Паглыбленне і абнаўленне філасофскіх асноў разумення ўсёй духоўнай гісторыі беларускай нацыі з перспектывай вылучэння прыярытэту нацыянальнай ідэі .

### Сучасная літаратура Беларусі: умовы і спецыфіка развіцця, падыходы да вывучэння. Частка другая.

Адначасовая праца ў літаратуры другой паловы 1980-х – 2000-я гады прадстаўнікоў розных пакаленняў: ушанаваных нацыяй народных пісьменнікаў Беларусі (Максім Танк, 1912 – 1995; Янка Брыль, 1917 – 2006; Пімен Панчанка, 1917 – 1995; Іван Шамякін, 1921 – 2004; Васіль Быкаў, 1924 – 2003; Іван Навуменка, 1925 – 2006, Іван Чыгрынаў, 1934 – 1996 ; а таксама Ніл Гілевіч, нар. 1931; Рыгор Барадулін, нар. 1935); актыўная праца іншых пісьменнікаў з жыццёвым вопытам значнай часткі XX стагоддзя (А. Адамовіч, В. Адамчык, І. Пташнікаў, В. Казько, А. Вярцінскі, М. Стральцоў, Я. Янішчыц, А. Разанаў, Р. Баравікова, інш.) поруч з тымі, хто толькі пачынаў свой шлях у літаратуры на мяжы XX –XXI стст.

Праблема пераемнасці сучаснага этапу літаратурнага развіцця з папярэднім. Адметнасць праяў у беларускай літаратуры розных эстэтыка-

выяўленчых кірункаў, плыняў, тэндэнцый: рэалізму, неарамантызму, авангардызму, імпрэсіянізму, постмадэрнізму і інш. Сувязь сучаснай літаратуры з філасофіяй экзістэнцыялізму, пазітывізму і інш. Развіццё духоўна-рэлігійных матываў.

Авангардныя пошукі творчай моладзі: характар наватарства. Літаратурныя суполкі моладзі 1980—90-х гг.: "Тутэйшыя", "Таварыства вольных літаратараў", "Бум-Бам-Літ". Беларускі літаратурны перыядычны друк: часопісы "Полымя, "Маладосць", "Крыніца", "Першацвет", "Калосьсе", "Arche" і інш.

Новы імпульс у развіцці тэатральнага мастацтва, стварэнне ўмоў для існавання разнастайных мадэляў тэатраў. Новая генерацыя беларускіх драматургаў і рэжысёраў.

Полілінгвістычнасць літаратуры Беларусі. Стварэнне мастацкіх твораў на розных мовах: рускай, польскай, ідыш, іспанскай, нямецкай, курдскай, армянскай і інш. Білінгвізм у савецкія і постсавецкія часы (пісьменніцкія "самапераклады" (В. Быкаў), праблемы валодання роднай мовай і выбару мовы творчасці: А. Адамовіч, С. Алексіевіч, інш. Сучасная рускамоўная літаратура Беларусі (проза М. Чаргінца, паэзія У. Скарынкіна, драматургія А.Паповай, інш.). Пераклады: з чэшскай, сербскай, польскай і іншых моў.

Трывога сучаснай літаратуры пра вечныя духоўныя каштоўнасці, захаванне гуманізму.

## Тэма №2.
## Сучасная беларуская паэзія: дынаміка мастацкіх стыляў

Мадэрнізацыя мастацкай свядомасці. Эстэтычна-стылёвыя кірункі і тэндэнцыі развіцця беларускай паэзіі другой паловы 80-х гг. – пачатку XXI стагоддзя. Найбольш значныя кнігі паэзіі гэтага часу М. Танка, П. Панчанкі, Р. Барадуліна, Н. Гілевіча, В. Зуёнка, Я. Сіпакова, Г. Бураўкіна, Д. Бічэль, А. Разанава, Р. Баравіковай, Л. Дранько-Майсюка, інш. Прыход у літаратуру другой паловы 80-х – пачатку 90-х гг. новага пакалення паэтаў. Тэматычнае багацце і жанравая разнастайнасць беларускай паэзіі. Публіцыстычнасць і грамадзянскасць прамаўлення ў творах П. Панчанкі, Н. Гілевіча, П. Макаля, В. Зуёнка і інш. Паяднанне публіцыстычнага, філасофскага і інтымнага-псіхалагічнага пачаткаў у сучаснай лірыцы. Адлюстраванне трагедыйных перыпетый XX стагоддзя ў сучаснай паэзіі (А. Звонак, С. Грахоўскі, інш.). Пейзажная лірыка, вострае экалагічнае гучанне вершаў пра прыроду (М. Танк, Р. Барадулін, С. Законнікаў, М. Мятліцкі, інш.). Вобразы беларускай міфалогіі (М. Танк, Р. Барадулін, А. Мінкін, А. Сыс, інш.). Лірыка кахання Я. Янішчыц, Г. Бураўкіна, Р. Баравіковай, Л. Дранько-Майсюка, Г.Дубянецкай, інш. Наватарства ў галіне вершаванай формы і іншыя мастацкія пошукі сучаснай паэзіі.

## Тэма №3.
## Развіццё паэтычнага эпасу ў другой палове 80-х гг. XX стагоддзя – пачатку XXI стагоддзя

Беларуская паэма на сучасным этапе: жанравая сінтэтычнасць, разнастайнасць мастацкіх формаў, інш. Здабыткі на ніве сучаснага паэтычнага эпасу (Н. Гілевіч, П. Бітэль, М. Арочка, В. Зуёнак, Р. Барадулін, Ю. Свірка, Ю. Голуб і інш.). Выяўленне розных аспектаў чалавечага быцця: маральнага, сацыяльнага, гістарычнага, рэлігійнага і інш. Мастацкія дакументы часу перабудовы: П. Панчанка. "Паэма сораму і гневу". Г. Каржанеўская. "Рэтушоры". Эмацыянальна-псіхалагічная змястоўнасць і публіцыстычнасць паэмы С. Законнікава "Чорная быль". Асэнсаванне чарнобыльскай трагедыі ў паэме Я. Сіпакова "Одзіум", інш. "Падарожжа вакол двара" – заключная паэма з ліра-эпічнага цыкла В. Зуёнка "Пяцірэчча". Паэмы ў дарозе Я. Сіпакова: "Хата", "Ахвярны двор", "Услед за травою", "З чужымі багамі". Драматызацыя паэмнага жанру: творы М.Арочкі, А. Лойкі, У. Дзюбы, Р. Баравіковай, Л. Рублеўскай, У. Скарынкіна, інш. Інтэлектуальная заглыбленасць думкі ў творах А. Разанава "Паэма парушанай мяжы", "Паэма пагашаных люстэрак", "Гліна", "Усяслаў Чарадзей", інш. Лірыка-маналагічны характар асобных сучасных паэм. Адметнасць мастацкай формы і стылістыкі паэмных твораў А. Мінкіна "Апошняе казанне Белабога", Э. Акуліна "Шлях да Радзімы". Мадэрнізацыя беларускай паэмы – вынік эстэтычнай рухомасці жанру, актывізацыі асацыятыўна-ёмістага тыпу мыслення.

## Тэма №4.
## Сучасная беларуская філасофская паэзія

Традыцыі філасафізму (М. Багдановіч, У. Дубоўка, А. Куляшоў, інш.) і яе ўплыў на паэзію 70-80-х і наступных дзесяцігоддзяў. Інтэлектуалізм вершаванага мыслення, жыццёва-пазнавальны рух паэтычнай думкі. Інтэлектуальна-філасофская плынь у беларускай паэзіі: М. Танк, С. Дзяргай, А. Русецкі, У. Караткевіч, М. Стральцоў, А. Вярцінскі, П. Макаль, А. Разанаў, Г. Булыка і інш. Сучасная паэзія ў спазнанні сутнасці часу, быцця свету. Біблейска-філасофскія і экзістэнцыяльныя матывы ў сучаснай паэзіі. Роля А. Разанава ў развіцці традыцый беларускай філасофскай паэзіі. Наватарскі характар яго творчасці. Непаўторнасць лірыка-рамантычнага светаадчування ў паэзіі А. Пісьмянкова. Паэзія А. Сыса як сімвал пошукаў у паэзіі канца XX стагоддзя.

## ТЭМА №5.
## Сучасная беларуская проза: асноўныя тэндэнцыі развіцця

Агульныя тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай прозы. Адначасная і гарманічная прысутнасць пісьменнікаў розных пакаленняў (старэйшага, сярэдняга і малодшага ).

Мастацкія набыткі старэйшага літаратурнага пакалення : асэнсаванне нацыянальнага мінулага ў творах У. Караткевіча , напружаны ўнутраны пошук этычна-грамадзянскага выбару ў творах В. Быкава, адкрыццё сацыяльнага сэнсу ў грамадскіх канфліктах сучаснасці аповесцей І.Шамякіна, лірычна-філасофскае асэнсаванне жыцця ў творах Я. Брыля, адкрытая, публіцыстычна-завостраная філасофія гуманізму ў прозе А. Адамовіча; рамантызаванае і ў той жа час праўдзівае раскрыццё складаных жыццёвых калізій у творах І. Навуменкі; гістарычная дакладнасць псіхалагічнай і сацыяльнай характарыстыкі ў творах В. Адамчыка; тонкі аналіз душэўных зрухаў у прозе Я. Сіпакова; спасціжэнне натурфіласофскіх асноў быцця ў творчасці В. Карамазава і А. Жука; маральнае абвастрэнне сацыяльна-побытавых узаемаадносін у творах В. Казько і інш. Суадносіны традыцый і наватарства.

Праблема арыгінальнага і эпігонскага, вучнёўскага, эстэтычна недасканалага ў сучаснай літаратуры (абавязковая прысутнасць станоўчага героя, апісальніцтва, аўтарскае маралізатарства, дэкларатыўнасць, самапахвальба і інш.). Ідэйна-мастацкія дасягненні сучаснай беларускай прозы: паглыбленне асабістага, суб'ектыўнага бачання жыцця, суіснаванне розных кірункаў і плыняў, новыя шляхі спасціжэння чалавека-сучасніка, задавальненне эстэтычных запатрабаванняў чытача і інш.

Прагнозы развіцця сучаснай беларускай прозы.

## ТЭМА №6.
## Тэматычная разнастайнасць сучаснай беларускай прозы

Тэма ваеннага мінулага: новыя падыходы ў мастацкім асэнсаванні. Трагічная праўда часу ў творах другой паловы 1980-х – пачатку XXI стст. (А.Адамовіч, В. Быкаў, І. Шамякін, І. Чыгрынаў і інш. ). Чалавек і вайна, вёска ў гады акупацыі, памяць пра вайну ў творах сучасных пісьменнікаў.

Лёс беларускага народа ў XX ст. у асэнсаванні сучаснай прозы (В. Карамазаў, Г. Далідовіч, У. Гніламёдаў і інш.). Трагедыйнае адлюстраванне даваеннага часу: В. Быкаў ("Аблава") і інш. Чарнобыльская тэма ў творах беларускіх пісьменнікаў: І. Пташнікаў ("Львы"), І. Шамякін ("Злая зорка"), В. Карамазаў ("Краем Белага шляху") і інш.

Тэма гістарычнага мінулага ў беларускай прозе. Сінтэз гістарычнай праўды і мастацкага вымыслу: рамантызацыя далёкага мінулага, зварот да міфалогіі і легендарнага матэрыялу, дакументалізм і публіцыстычнасць. Падзеі і вобразы беларускай гісторыі ў празаічных творах сучасных

пісьменнікаў ( У. Арлоў, К. Тарасаў, І. Шамякін, В. Іпатава, Г. Далідовіч, Л.Дайнека, В. Чаропка, А. Наварыч і інш.).

Тэма сталінскіх рэпрэсій ў беларускай літаратуры. Творы, напісаныя на мемуарным матэрыяле (М. Бяганская, "Мая Галгофа"; Л. Генiюш, "Споведзь", С. Грахоўскі, "Такія сінія снягі"; П. Пруднікаў "Яжоўскія рукавіцы", інш.).

Адносіны да вёскі, да роднага кутка як адна з асноўных рыс, светапоглядных асноў сучаснай літаратуры. Традыцыі рэалістычнага паказу вясковага жыцця ў беларускай літаратуры. Спасціжэнне "вясковай" прозай вытокаў нацыянальнай своеасаблівасці, адметнасці народа. Паказ сацыяльных зрухаў у сённяшнім жыцці вёскі і змена характару героя ў творах А. Жука, В. Казько, Г. Марчука, А. Федарэнкі, Х. Лялько, А.Наварыча, А. Казлова і інш.

Паварот сучаснай беларускай літартуры ад традыцыйна-вясковай тэматыкі да ўвасаблення гарадской рэчаіснасці. Адлюстраванне урбанізаванага жыцця і побыту ў празаічных творах М. Стральцова, А.Глобуса, А. Асташонка, Г. Багданавай, А. Бахарэвіча і інш.

## ТЭМА №7.
## Развіццё новых жанраў у сучаснай беларускай прозе

Жанрава-стылявая эвалюцыя сучаснай беларускай прозы. Пашырэнне мастацкага досведу ў сучаснай літаратуры. Публіцыстычнасць як прыкмета новай змястоўнасці нацыянальнай прозы.

Формы і прыёмы мастацкай умоўнасці (В. Казько, У. Рубанаў, А. Казлоў, інш.). Фантасмагорыя і містыка як спосаб мастацкага светаасэнсавання (В.Адамчык, "Падарожжа на Буцафале"). Антыўтопія ў сучаснай літаратуры. Выкарыстанне пісьменнікамі міфалагічных і казачных сюжэтаў і матываў. Узбагачэнне беларускай фантастыкі. Навукова-фантастычныя гіпотэзы і іх уплыў на мастацкую літаратуру. Жанр фэнтэзі ў сучасным мастацтве ( Р. Баравікова, А. Паўлухін, інш.). Адметнасць стылістыкі і кампазіцыі фантастычных твораў Л. Дайнекі "Чалавек з брыльянтавым сэрцам", Я. Сіпакова "Блуканні па іншасвеце". Фантастычныя карціны ў творах В. Гігевіча "Карабель", "Палтэргейст", "Кентаўры", "Пабакі" і інш. Героі пісьменніка, іх светаадчуванне і жыццёвыя прынцыпы. Інтэлектуальная і маральна-этычная заглыбленасць прозы В. Гігевіча, яе гуманістычная скіраванасць.

Дэтэктыўны жанр у беларускай літаратуры. Працяг традыцый, закладзеных У. Караткевічам: займальны сюжэт, прынцып загадкавасці, вострая інтрыга, незвычайнасць вобразаў. Праблематыка і асаблівасці аўтарскай канцэпцыі ў творах Г. Марчука, Ю. Станкевіча, М. Клімковіча, М.Адамчыка, Л. Рублеўскай і інш.

"Спавядальная" проза і жанр дзённіка ў сучаснай беларускай прозе. Аўтабіяграфізм твораў і павышэнне эстэтычнага значэння дакументальнасці ў беларускай літаратуры : І. Пташнікаў – "Ірга каласістая", "Тры пуды

жыта", В. Быкаў – "Доўгая дарога дадому", А. Адамовіч – "Vixi", І.Навуменка – "Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва", І. Шамякін – "Начныя ўспаміны", "Промні маленства" і інш. Інтэнсіўны зварот да асабістага мінулага як вынік паглыблення сучаснага светаадчування ў літаратуры.

## ТЭМА № 8.
## Сучасны літаратурны этап : развіццё прозы (2000 – 2012-я гг.)

Змена статуса літаратуры ў грамадстве, яе ўпісванне ў "рынкавую" эканоміку: незапатрабаванасць пісьменніцкай працы, змяншэнне колькасці перакладаў з беларускай мовы на іншыя мовы свету і наадварот, рэдкі выхад анталогій твораў па беларускай літаратуры і інш. Дэцэнтралізацыя літаратурнага жыцця. Сучасная літаратура і інтэрнет. Новы спосаб літаратурнага мыслення і новыя формы трансляцыі і ўзаемаадносін з чытачом. Літаратурныя блогі ў інтэрнэце: новыя формы і новыя жанры. Перспектывы сеціўнай літаратуры.

Новыя часопісы і альманахі. Сучасныя літаратурныя прэміі. Творы сучасных аўтараў на тэатральнай сцэне. Дзейнасць беларускіх выдавецтваў ("Мастацкая літаратура", выдавецтва І. Логвінава, выдавецтва "Галіяфы", "Харвест" і інш.). Аб"ектыўныя ўмовы і суб'ектыўная настроенасць на выпрацоўку пісьменнікамі сучаснай сістэмы творчых каардынат.

Дэканструкцыя міфаў і вобразаў літаратуры сацрэалізму (сацыяльны гратэск у аповесці "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В. Казько, у рамане Ю. Станкевіча "Любіць ноч – права пацукоў"). Авангардныя пошукі маладых празаікаў. Трансгрэсія (парушэнне табу) ў творах з постмадэрнісцкай паэтыкай, якая ігнаруе маральна-этычныя традыцыі ў мастацтве (татальны гратэск у кнігах "Праклятыя госці сталіцы" А. Бахарэвіча і "Квадратная варона" І. Сідарука; эратычная тэма ў цыкле "Дамавікамерон" А. Глобуса). Гульня і правакацыя ў літаратуры ("Імя грушы" С. Балаханава, "Шлях дробнай сволачы" Е. Вежнавец). Тэндэнцыя да тэатралізацыі: перфомансы як тэатральна-літаратурныя праекты.

Сучасная "жаночая" проза: А. Брава, "Каменданцкі час для ластавак"; В.Куртаніч, "Залюстрэчча для Алісы", "Распусніца, або Чырвоная Шапачка са Швальмштата"; Н. Бабіна, "Крыві не павідна быць відна"; інш.

Развіццё прозы для дзяцей і юнацтва (аповесці і апавяданні У. Ліпскага, А. Федарэнкі, А. Наварыча, Л. Рублеўскай, А. Масла і інш.); працяг традыцый беларускай літаратурнай казкі (Р. Баравікова, У. Ягоўдзік, С.Кавалёў). Спробы ў жанры комікса (У. Ліпскі, А. Глобус і У. Сцяпан).

Жанрава-стылёвыя дамінанты сучаснай беларускай прозы. Абнаўленне і жанравая трансфармацыя сучаснага беларускага рамана : тэндэнцыя да цыклізацыі (А. Асіпенка, У. Гніламёдаў, В. Якавенка і інш.), гістарычны раман (У. Арлоў, А. Федарэнка, Л. Рублеўская і інш.). Магчымасці публіцыстыкі, філасофскай эсэістыкі ў адлюстраванні новых з'яў жыцця (В.Казько, У. Арлоў, Р. Барадулін, В. Карамазаў, Ю. Барысевіч і інш.).

## Тэма №9.
## Сучасная беларуская драматургія: традыцыі і наватарства

Агульныя тэндэнцыі ў развіцці драматургіі другой паловы 80-х гг. XX стагоддзя – пачатку XXI стагоддзя. Звесткі пра стан сучаснага тэатра і яго рэпертуар (пастаноўкі ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, Тэатры юнага гледача і інш.). Пашырэнне тэматыкі сучаснай драматургіі. Узмацненне ўвагі да досведу сусветнага драматургічнага і тэатральнага мастацтва. Зварот да вопыту драмы абсурду: А. Дзялендзік, Г. Багданава, І. Сідарук і інш. П’еса-рымейк у сучаснай драматургіі. “Германеўтычны праект” С. Кавалёва: п’есы на аснове пераасэнсавання беларускай літаратурна-культурнай спадчыны (“Францішка, або навука кахання” па матывах польскамоўнай драматургіі Ф.У. Радзівіл і тэатральнага барока, “Стомлены д’ябал” па матывах твораў К.Марашэўскага, Ф. Аляхновіча, Я. Купалы, інш.).

Тэма гістарычнага мінулага ў творчасці сучасных драматургаў: А. Петрашкевіч (“Прарок для Айчыны”, “Меч Рагвалода”, інш.), І. Чыгрынаў (“Звон – не малітва”, “Следчая справа Вашчылы”, “Прымак”, інш.), Р. Баравікова (“Барбара Радзівіл”) і інш. Чарнобыль у п’есах беларускіх драматургаў (І. Чыгрынаў. “Хто вінаваты”, “Толькі мёртвыя не вяртаюцца”; М. Матукоўскі. “Бездань”; А. Дудараў. “Адцуранне”; В. Ткачоў. “Блакада ў Кругліцы” і інш.). Трагічны лёс беларускай вёскі і сялянства ў п’есе У. Бутрамеева “Страсці па Аўдзею”. Сатыра і гумар у камедыях М. Матукоўскага “Мудрамер”, У. Сауліча “Сабака з залатым зубам” і інш. Агляд драматургіі для дзяцей.

Творчасць Аляксея Дударава. Асаблівасці драматургічнага майстэрства. Творчыя пошукі А. Дударава ў другой палове 80-х – 90-я гг. Гістарычныя вобразы ў п’есах “Купала”, “Чорная панна Нясвіжа”, інш. Своеасаблівасць аўтарскай версіі мінулага. Традыцыі У. Шэкспіра і драматургія А. Дударава. Жанравая і сюжэтна-кампазіцыйная адметнасць п’ес сучаснага аўтара.

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

| Узроўні | Балы | Паказчыкі адзнакі |
|---|---|---|
| | 0 | Адсутнасць адказу або адмова ад адказу. |
| 1. Нізкі | 1 | Пазнаванне аб'екта вывучэння, распазнаванне асобных вядомых тэрмінаў і фактаў; праяўленне імкнення пераадольваць вучэбныя цяжкасці; праяўленне сітуатыўнай цікавасці да вывучэння і прадмета. |
| | 2 | Пазнаванне аб'екта вывучэння, размежавання вызначэнняў і асобных тэрмінаў; наяўнасць матывацыі для пераадолення вучэбных цяжкасцей. |
| 2. Задавальняючы | 3 | Недакладнае ўзнаўленне вучэбнага матэрыялу; наяўнасць істотных, аднак выпраўляемых з дапамогай выкладчыка памылак; цяжкасці з прымяненнем спецыяльных і інтэлектуальных уменняў; наяўнасць матывацыі для пераадолення вучэбных цяжкасцей і сітуатыўнай цікавасці да аб'екта вывучэння. |
| | 4 | Засваенне вывучаемага матэрыялу на рэпрадуктыўным узроўні, аднак наяўнасць памылак пры ўзнаўленні; магчымасць выпраўлення памылак з дапамогай дадатковых пытанняў; цяжкасці з прымяненнем спецыяльных і інтэлектуальных уменняў; уменне крытычны ацаніць уласныя веды; наяўнасць свядомага імкнення да пераадолення цяжкасцей пры вывучэнні матэрыялу. |
| 3. Сярэдні | 5 | Свядомае ўзнаўленне вучэбнага матэрыялу рознага ўзроўню складанасці з неістотнымі памылкамі, недакладнасцямі; цяжкасці з прымяненнем асобным спецыяльных навыкаў; зацікаўленасць у вывучэнні матэрыялу і выпраўленні памылак. |
| | 6 | Дакладнае ўзнаўленне вучэбнага матэрыялу з неістотнымі памылкамі; свядомае карыстанне спецыяльнымі ўменнямі і навыкамі; настойлівасць і зацікаўленасць у выпраўленні памылак; сітуатыўнае праяўленне імкнення да творчасці. |
| 4. Дастатковы | 7 | Валоданне вучэбным матэрыялам рознай ступені складанасці; самастойнае прымяненне спецыяльных уменняў і навыкаў; наяўнасць неістотных недакладнасцяў у адказе; імкненне да творчага выкарыстання атрыманых ведаў, спецыяльных уменняў і навыкаў. |
| | 8 | Валоданне вучэбным матэрыялам і свабоднае выкарыстанне яго як у знаёмых, так і ў незнаёмых сітуацыях; наяўнасць адзінкавых неістотных памылак і самастойнае іх выпраўленне; наяўнасць вопыту творчай |

| | | |
|---|---|---|
| | | дзейнасці; наяўнасць сістэматычнасці і вопыту ў выкарыстанні атрыманых ведаў, уменняў і навыкаў. |
| 5. Высокі | **9** | Свабоднае валоданне вучэбным матэрыялам рознай ступені цяжкасці; дакладнасць, лагічнасць і сістэматычнасць пры яго ўзнаўленні; здольнасць самастойна аналізаваць і рабіць высновы; наяўнасць вопыту творчай дзейнасці; высокі ўзровень самастойнасці ў вывучэнні матэрыялу; высокі ўзровень эрудыцыі. |
| | **10** | Свабоднае валоданне вучэбным матэрыялам рознай ступені цяжкасці з выкарыстаннем вучэбнага матэрыялу іншых дысцыплін; дакладнасць, лагічнасць і сістэматычнасць пры яго ўзнаўленні; здольнасць самастойна аналізаваць і рабіць высновы; уменне свядома выкарыстоўваць атрыманыя веды, уменні і навыкі для вырашэння праблем у нестандартных сітуацыях; праяўленне мэтанакіраванасці, адказнасці, творчага падыходу і пазнавальнай актыўнасці пры самастойным вывучэнні матэрыялу; высокі ўзровень эрудыцыі. |

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

1. Апытанне вуснае і пісьмовае.
2. Тэставыя заданні закрытага і адкрытага тыпу.
3. Рэфераты.
4. Творчыя працы.
5. Аналітычная праца з ілюстрацыйным матэрыялам.
6. Германеўтычная інтэрпрэтацыя тэкстаў.
7. Курсавыя і дыпломныя работы.

## ЛІТАРАТУРА
### Асноўная

1. Адамович, А. Ничего важнее: Соврем. пробл. воен. прозы / А. Адамович. — 2-е изд. -- Минск., 1987.
2. Арочка, М. На парозе 90-х : літ. агляд / М. Арочка. --- Мінск, 1993.
3. Астраух, А.Э. Рыгор Барадулін і сучасная беларуская лірыка / А.Э. Астраух. – Гродна, 2001.
4. Афанасьеў, І. Чарнобыльскае светаадчуванне ў сучаснай беларускай літаратуры / І. Афанасьеў. — Мінск., 2001.
5. Беларуская літаратура: XI—XX стст.: дапам. для шк., ліцэяў, гімназій, ВНУ / А. І. Бельскі, У. Г. Кароткі, П. І. Навуменка і інш. — 2-е выд., дапрац. — Мінск, 2001.
6. Беларускія пісьменнікі (1917—1990): Даведнік / Склад. А. К. Гардзіцкі. — Мінск, 1994.
7. Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўнік: У 6 т. — Мінск, 1992—1995.
8. Бельскі, А.І. Галасы і вобразы: літ.-крыт. артыкулы / А.І. Бельскі. – Мінск, 2008.
9. Бельскі, А. І. Сучасная беларуская літаратура: Станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80—90-я гг.): Дапам. для настаўнікаў / А.І. Бельскі. — Мінск, 1997.
10. Бельскі, А.І. Сучасная літаратура Беларусі : дапам. для настаўнікаў / А. І. Бельскі. – Мінск, 2000.
11. Бугаёў, Д. Спавядальнае слова : літ. крытыка, успаміны / Д. Бугаёў. – Мінск, 2001.
12. Бязлепкіна, А.П. Разам і паасобку:Таварыства "Тутэйшыя" / А.П. Бязлепкіна. – Мінск, 2003.
13. Васючэнка, П. Пошукі страчанага дзяцінства: Бел. празаікі "сярэд. пакалення" аб Вялікай Айчыннай вайне / П. Васючэнка. — Мінск, 1995.
14. Васючэнка, П. Сучасная беларуская драматургія / П. Васючэнка. — Мінск, 2000.
15. Гарадніцкі, Я. А. Думка і вобраз: Праблема інтэлектуалізму ў сучас. бел. лірыцы / А.Я. Гарадніцкі. — Мінск, 1986.
16. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т./ Нац. акад.навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мінск, 1999—2003. Т.4, кн. 2: 1986—2000.
17. Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці / У. Гніламёдаў. – Мінск, 2001.
18. Гніламёдаў, У. Класікі і сучаснікі: Арт., нарысы, старонкі ўспамінаў / У. Гніламёдаў. — Мінск, 1987.
19. Грамадчанка, Т.К., Гурская, А.С., Гарэлік, Л.М. Праблемы сучаснай беларускай крытыкі / Т.К. Грамадчанка, А.С. Гурская, Л.М. Гарэлік. – Мінск, 1996.

20.Жук, І. Сустрэчны рух: літаратуразнаўчыя эцюды / І. Жук. – Гродна, 1998.

21.Кавалёў,С. Партрэт шкла: Літ.-крытыч. арт. / С. Кавалёў. — Мінск, 1991.

22.Калеснік, У. Усё чалавечае : літ.-крытыч. арт. / У. Калеснік. – Мінск, 1993.

23.Калядка, С.У. Беларуськя сучасная жаночая паэзія: Мастацкая канцэпцыя “жаночага шчасця” / С.У. Калядка. – Мінск, 2010.

24.Кісліцына, Г. Новая літаратурная сітуацыя / Г. Кісліцына. – Мінск, 2006.

25.Кісліцына, Г. Алесь Разанаў: Праблема мастацкай свядомасці / Г. Кісліцына. -- Мінск, 1997.

26.Козіч В. І. Чалавек і прырода у сучаснай беларускай прозе / В. І. Козіч. — Мінск, 1998.

27.Корань, Л. Цукровы пеўнік: літ.-крыт. арт. / Л. Корань. – Мінск, 1996.

28.Ламека, Л., Ламека, Н. Сучасная беларуская літаратура / Л. Ламека, Н. Ламека. – Мінск, 2003.

29.Лойка, А. Галгофа: Кн. лёсаў / А. Лойка.— Слонім, 2001.

30. Лявонава Е.А. Агульнае і адметнае: Творы бел. пісьменнікаў XX ст. у кантэксце сусветнай літаратуры / Е.А. Лявонава. – Мінск, 2003.

31. Літаратура пераходнага перыяду : тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу . – Мінск, 2007.

32. Марціновіч, А.А. Шляхам праўды: Выбраныя старонкі беларускай літаратуры ў святле сённяшняга дня: дапам. для наст. / А.А. Марціновіч. – Мінск, 1994.

33. Мішчанчук, М. Беларуская літаратура XX ст. : вучэб. дапам. / М. Мішчанчук. – Мінск, 2001.

34. Ратабыльская, Т.А. “Спыніся, імгненне…”: Старонкі тэатральнага жыцця Беларусі 1990-х гг. / Т.А. Ратабыльская. – Мінск, 2000.

35. Стральцова, В. Шлях да сябе : сучас. аўтабіягр. проза як сістэма / – Мінск, 2002.

36. Тычына, М.А. Карані і крона: Фальклор і літаратура / М.А. Тычына. 2-е выд. – Мінск, 2002.

37. Тэатральная Беларусь: Энцыкл.: у 2-х т. – Мінск, 2002-2003.

38. Чабан, Т.К., Гарадніцкі , Я.А. Сучасная паэзія і фальклор / Т.К. Чабан, Я.А. Гарадніцкі . – Мінск, 1988.

39. Шаблоўская, І.В. Сусветная літаратура ў беларускай прасторы: Рэцэпцыя. Тыпалогія. Кантакты / І.В. Шаблоўская. – Мінск, 2007.

40. Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі (нарысы) / Т.І. Шамякіна. – Мінск, 2000.

41. Шамякіна, Т.І. Міфалогія і беларуская літаратура: нарысы і эсэ / Т.І. Шамякіна. -- Мінск, 2008.

42. Шаўлякова, І. Рэстаўрацыя шчырасці / І. Шаўлякова. – Мінск, 2005.

43. Штэйнер, І.Ф. Споведзь перад Богам і людзьмі: Беларуская літаратура на стыку тысячагоддзяў / І.Ф. Штэйнер. – Гомель, 2007.

44. Штейнер, І. Deja vu, або Успамін пра будучыню : літ.-крыт. арт. / І.Ф. Штэйнер. – Мінск, 2003.

45. Чарота, І.А. Пошук спрадвечнай існасці: Бел. літ. XX ст. у працэсах нац. самавызначэння / І.А. Чарота. – Мінск, 1995.

**Дадатковая**

1. Алесь Адамовіч і час : Матэрыялы Адамовічаўскіх чытанняў. – Мінск, 1998.

2. Арочка М.М., Дзюбайла П.К., Лаўшук С.С. На парозе 90-х: Літ. агляд / М.М. Арочка, П.К. Дзюбайла, С.С. Лаўшук. –Мінск, 1993.

3. Афанасьев И. Кто восходит на Голгофу?: Антивоенная идея в творчестве В. Быкова / И. Афанасьев. – Минск, 1993.

4. Бельскі А.І. Беларуская літаратура XX стагоддзя: Гісторыя і сучаснасць / А.І. Бельскі. – Мінск, 2005.

5. Бельскі А.І. Жывая мова краявідаў / А.І. Бельскі. – Мінск, 1997.

6. Бельскі А.І. Класікі і сучаснікі ў школе / А.І. Бельскі. – Мінск, 2005.

7. Бельскі А.І. Краса і смутак: Дапам. для настаўнікаў / А.І. Бельскі. – Мінск, 2000.

8. Бугаёў Д.Я. Служэнне Беларусі: Прабл. арт., літ. партрэты, эсэ, успаміны / Д.Я. Бугаёў. – Мінск, 2003.

9. Вобраз – 86: Літ.-крытыч. арт. – Мінск, 1986.

10. Вобраз –88: Літ.-крытыч. арт. – Мінск, 1988.

11. Вобраз – 90: Літ.-крытыч. арт. – Мінск, 1990.

12. Гараднiцкі Я. А. Мастацкі свет беларускай літаратуры XX стагоддзя / Я. А. Гараднiцкі. – Мінск, 2005.

13. Гарэлік Л.М., Козіч В.І., Лаўшук С.С. і інш. Літаратура // Беларусь на мяжы стагоддзяў / Л.М. Гарэлік, В.І. Козіч, С.С. Лаўшук і інш. – Мінск, 2000. – С. 305—320.

14. Да 80-годдзя народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава: Зб. навук. арт. –

Мінск, 2005.

15. Друк Г. М. У храме Слова: Міфатворчасць В. Казько / Г.М. Друк. – Мінск, 2005.

16. Каваленка В.А. Покліч жыцця: Літ. крытыка / В.А. Каваленка. --- Мінск, 1987.

17. Кавалёў С. Як пакахаць ружу…: Літ.-крытыч. арт. / С. Кавалёў. – Мінск,1989.

18. Локун В. Кругі жыцця – кругі літаратуры / В. Локун. – Мінск, 2002.

19. Марціновіч А.А. Іван Чыгрынаў: Нарыс жыцця і творчасці / А.А. Марціновіч. – Мінск, 1998.

20. Мікуліч М.У. Максім Танк і сучасная беларуская лірыка / М.У. Мікуліч. – Мінск, 1994.

21. Навумовіч У.А. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. / У.А. Навумовіч. – Мінск, 2000.

22. Рагуля А. Пафас станаўлення: Літ.-крытыч. арт. / А. Рагуля. – Мінск, 1991.

23. Ратабыльская Т.А. "Спыніся, імгненне…": Старонкі тэатр. Жыцця Беларусі 1990-х гг. / Т.А. Ратабыльская. – Мінск, 2000.

24. Савік Л. Адна між замкаў: Літ. партрэт В. Іпатавай / Л. Савік. – Мінск, 2003.

25. Саламаха У. Сусвет дабрыні: Эсэ, арт., дыялогі / У. Саламаха. – Мінск, 2005.

26. Шаўлякова І. Сентыментальнае паляванне: Арт., рэцэнзіі / І. Шаўлякова. – Мінск, 2000.

27. Шынкарэнка В.К. Нястомных пошукаў дарога: Праблемы паэтыкі сучас. бел. гістарычнай прозы / В. К. Шынкарэнка. – Мінск, 2002.

## ПЫТАННІ ДЛЯ САМАПАДРЫХТОЎКІ

1. Мастацкія асаблівасці сучаснай беларускай паэіі.
2. Праблематыка і жанрава-стылёвыя пошукі сучаснай беларускай прозы.
3. Сучасная беларуская драматургія. Агульная характарыстыка.
4. Адметнасць паэзіі М. Танка другой паловы 80-х -- першай паловы 90-х гадоў XX ст.
5. Праблематыка, нацыянальная і агульначалавечая каштоўнасць паэіі П.Панчанкі другой паловы 80-х -- першай паловы 90-х гадоў XX ст.
6. Сучасная паэзія Н. Гілевіча: праблематыка і мастацкія асаблівасці.
7. Адметнасць сучаснай паэіі Р. Барадуліна.
8. Праблема традыцый і наватарства ў сучаснай паэіі А. Разанава.
9. Эстэтызм сучаснай паэзіі Л. Дранько-Майсюка.
10. Паэзія А. Сыса
11. Творчая індывідуальнасць В.Шніпа ў кнізе "Балада камянёў".
12. Высокая культура і духоўнасць сучаснай прозы Я. Брыля.
13. Экзістэнцыяльны змест аповесцяў В. Быкава, створаных у канцы XX -- пачатку XXI стст.
14. Мастацкая спецыфіка апавяданняў і прыпавесцяў В.Быкава, створаных у канцы XX — пачатку XX стст.
15. Лёс пісьменніка і народа ў кнізе В. Быкава "Доўгая дарога дадому".
16. Маральна-этычныя праблемы і стылёвыя асаблівасці аповесцяў І.Шамякіна "Слаўся, Марыя!", "Вернісаж", "Выкармак", "У засені палаца" і інш.
17. Гісторыя і сучаснасць у раманах І. Шамякіна "Вялікая княгіня" і "Губернатар".
18. Чарнобыльская тэматыка ў сучаснай беларускай літаратуры.
19. Кніга Л. Геніюш "Споведзь".
20. Аповесці С. Грахоўскага "Зона маўчання", "З воўчым білетам", "Такія сінія снягі".
21. "Аповесць для сябе" Б. Мікуліча.
22. Сучасныя апавяданні І. Пташнікава.
23. Кніга прытчаў Я. Сіпкова "Тыя, што ідуць".
24. Мінуўшчына ў раманах В. Іпатавай "Залатая жрыца Ашвінаў", "Вяшчун Гедзіміна", "Альгердава дзіда"
25. Асэнсаванне гісторыі ў рамане А. Наварыча "Літоўскі воўк".
26. Творчасць Г. Марчука
27. Проза А. Федарэнкі.
28. Сучасная драматургія А. Дударава.
29. Мастацкія пошукі С. Кавалёва-драматурга.
30. П'еса У. Бутрамеева "Страсці па Аўдзею" ("Крык на хутары").

## ПРАПАНУЕМАЯ ТЭМАТЫКА РЭФЕРАТЎ

1. Тэндэнцыі і заканамернасці развіцця сучаснай беларускай літаратуры.
2. Чарнобыльская трагедыя ў адлюстраванні беларускай літаратуры.
3. Грамадзянская і публіцыстычная лірыка сучасных паэтаў.
4. Філасофскія матывы ў творчасці сучасных беларускіх паэтаў (аўтары прапануюцца на выбар).
5. Сучасны паэтычны эпас: мастацкія набыткі, тэматычная і стылёвая разнастайнасць.
6. Эстэтычнае абнаўленне сучаснай прозы, яе пошукі і набыткі.
7. Чалавек і вайна ў беларускай прозе другой паловы 1980-х — 1990-х гадоў XX стагоддзя.
8. Праўда пра сталінскія часы ў творах сучасных беларускіх пісьменнікаў.
9. Сучасная беларуская проза пра вёску.
10. Мастацкае асэнсаванне гісторыі ў творах сучасных пісьменнікаў.
11. Горад у творах сучасных пісьменнікаў.
12. Уладзімір Караткевіч і сучасны мастацкі дэтэктыў.
13. Беларуская мастацкая фантастыка нашых дзён.
14. Жанрава-тэматычная разнастайнасць сучаснай беларускай драматургіі.
15. Стан і развіццё мастацкага перакладу ў сучаснай Беларусі.
16. Асаблівасці творчасці Максіма Танка на сучасным этапе.
17. Праблемна-тэматычны змест паэзіі Пімена Панчанкі 1990-х гадоў.
18. Мастацка-выяўленчая адметнасць паэзіі Рыгора Барадуліна.
19. Характэрныя рысы творчай індывідуальнасці Івана Навуменкі.
20. Псіхалагічнае майстэрства ў апавяданнях Івана Чыгрынава.
21. Своеасаблівасць творчай манеры Ніла Гілевіча.
22. Канцэпцыя чалавека і часу ў творах Алеся Адамовіча пра вайну.
23. Экзістэнцыялізм і творчасць Васіля Быкава.
24. Апавяданне і прыпавесць ў творчасці Васіля Быкава 1990-х гадоў.
25. Маральна-этычныя праблемы ў творах Івана Шамякіна пра сучаснасць.
26. Раманістыка Івана Шамякіна, яе асаблівасці.
27. Стыль прозы Івана Шамякіна (на матэрыяле твораў 1990-х гадоў).
28. Мастацка-выяўленчая адметнасць паэзіі Рыгора Барадуліна.
29. Інтэлектуалізм і філасофская скіраванасць паэзіі Алеся Разанава.
30. Жанравая разнастайнасць сучаснай беларускай драматургіі.
31. Сучаснасць і гісторыя ў драматургіі Аляксея Дударава.
32. Характарыстыка творчасці аднаго з сучасных беларускіх пісьменнікаў (аўтар на выбар).

## ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ
## ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

1. Праблема перыядызацыі літаратуры ХХ ст. Сучасная літаратура Беларусі ( з другой паловы 1980-х гг.).
2. Сучасная літаратура Беларусі: асноўныя заканамернасці развіцця.
3. Патрыятычны пафас сучаснай беларускай літаратуры.
4. Сучасная беларуская паэзія: асаблівасці развіцця.
5. Жанравая разнастайнасць сучаснай беларускай паэзіі.
6. Развіццё паэтычнага эпасу на сучасным этапе.
7. Разнастайнасць творчых індывідуальнасцей ў сучаснай беларускай паэзіі.
8. Паэзія М.Танка і П.Панчанкі другой паловы 80-х – першай паловы 90-х гг. ХХ стагоддзя.
9. Мастацкае эксперыментатарства ў творчасці маладых паэтаў.
10. Рэлігійна-хрысціянскія матывы ў сучаснай беларускай паэзіі.
11. Творчасць Р.Барадуліна канца ХХ – пач. ХХІ стст.
12. Творчасць Н. Гілевіча канца ХХ – пач. ХХІ стст.
13. Адметнасць сучаснай паэзіі А.Разанава.
14. Мастацкія асаблівасці сучаснай паэзіі Л.Дранько-Майсюка.
15. Багацце тэм і матываў у сучаснай беларускай паэзіі.
16. Сучасная беларуская проза: агульныя тэндэнцыі развіцця.
17. Сённяшні дзень нацыянальнай прозы : прыярытэты развіцця.
18. Пісьменнікі старэйшага пакалення ў сучаснай беларускай літаратуры ( Я. Брыль, В. Быкаў, І. Навуменка, І. Шамякін і інш. ).
19. Пісьменнікі "сярэдняга" пакалення ў сучаснай беларускай літаратуры ( В. Адамчык, В. Гігевіч, Г. Далідовіч, А. Жук, В. Казько і інш.).
20. Пошукі новай эстэтычнай змястоўнасці ў прозе апошніх гадоў.
21. Творчасць В.Быкава 80-х гадоў ХХ ст. – пач. ХХІ ст.
22. Праблемы сучаснасці ў творах І. Шамякіна.
23. Асоба і наватарскі характар творчасці А. Адамовіча.
24. Новыя формы мастацка-вобразнага асэнсавання рэчаіснасці ў беларускай прозе.
25. Уладзімір Караткевіч і развіццё сучаснай дэтэктыўнай прозы.
26. Тэма вайны ў сучаснай беларускай прозе.
27. Тэма вёскі і горада ў сучаснай беларускай літаратуры.
28. Адлюстраванне чарнобыльскай трагедыі ў беларускай літаратуры.
29. Чалавек і прырода ў сучаснай беларускай прозе.
30. Жанр фантастыкі ў сучанай беларускай прозе.

31. Сучасная беларуская драматургія: асноўныя заканамернасці развіцця.
32. Шматжанравасць сучаснай беларускай драматургіі.
33. Праблемы сучаснасці ў беларускай драматургіі.
34. П”есы А.Дударава канца XX – пач. XXI стст.
35. Іншамоўныя пісьменнікі Беларусі.
36. “Спавядальная проза”( жанр дзённіка) ў сучаснай беларускай літаратуры.
37. Сучасны мастацкі пераклад у Беларусі.
38. Розгалас сучаснай літаратуры Беларусі ў свеце.

# ЗМЕСТ

Тлумачальная запіска……………………………………………………..3

Формы і метады навучання………………………………………………...5

Прыкладны тэматычны план дысцыпліны……………………………......6

Змест вучэбнай дысцыпліны...…………………..………………………7

Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці…………………………...14

Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі…………………………..15

Спіс літаратуры……………………………………………………………16

Пытанні для самападрыхтоўкі……………………………………………20

Прапануемая тэматыка рэфератаў...………………………………………21

Пытанні да заліку па дысцыпліне…………………………………………22

Вучэбнае выданне

**Сучасная літаратура Беларусі**
Тыпавая вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці:
1-21 05 01 “Беларуская філалогія” (па напрамках)

Складальнікі:
**Бельская Таццяна Віктараўна**
**Верабей Анатоль Леанідавіч**
Адказны за выпуск: Т.В. Бельская